**К. Калеснік**

# СПАВЯДАЛЬНАСЦЬ І ПСІХАЛАГІЗМ ЖАНОЧАЙ ПАЭЗІІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ

Праведзены аналіз пытанняў станаўлення і развіцця жаночай паэзіі паказаў, што лірыка беларускіх паэтэс займае адметнае месца ў літаратурным працэсе другой паловы XX стагоддзя. Амаль адначасовае "ўваходжанне" ў літаратуру вялікай колькасці паэтэс, сярод якіх Я. Янішчыц, Н. Мацяш і Р. Баравікова, дае падставы сцвярджаць аб узнікненні ў айчыннай літаратуры плеяды жанчын-паэтэс у дадзены перыяд.

Бліскавічна-светлая паэзія Яўгеніі Янішчыц, “мілага дзіцяці” Беларускага Палесся (як назваў яе Ніл Гілевіч у сваёй паэме “Сказ пра Лысую гару”). Творчасць паэтэсы адметная сваёй зіхоткасцю, яркасцю, гарманічнасцю пачуцця і думкі, спалучэннем душэўных перажыванняў з глыбокай філасафічнасцю і мае дыдактычны і прарочы характар. У вершах Я. Янішчыц ёсць лірычнае “я”, аднак нельга сказаць, што гераіня і паэтэса – гэта адна і тая ж асоба, як не варта сцвярджаць і таго, што кожная з іх існуе сама па сабе. У паэтэсы можна сустрэць вершы як пра каханне няспраўджанае і турботнае, так і пра вельмі шчырае і пяшчотнае. Дзеючая асоба ператвараецца ў птушку, у ліст дрэва, раскрываецца перад чытачом у палёце, які ўвасабляе натхненне, незямную асалоду і горыч адначасова. Уся творчасць Я. Янішчыц, асабліва інтымная лірыка, прасякнута шчырасцю, дабрынёй, наіўнасцю. Словы ў яе вершах ідуць з глыбіні жаночай і закаханай душы, якая зведала ў жыцці не толькі адзіноту, боль, але і вялікае шчасце кахання, якому прысвяціла значную колькасць сваіх радкоў.

Раіса Баравікова, актуалізаваўшы ў беларускай літаратуры лірыку кахання, надала ёй “масавы” характар, стварыла вобраз шчаслівага пачуцця. З яе імем звязана ўражанне прасветленасці, пяшчоты, рамантычна-ўзнёслых адносін да жыцця, эмацыянальнасці і высокай усхваляванасці. Такая ж яна і ў сваёй паэзіі, якую можна назваць сапраўды жаночай. Паняцце гэтае ў дадзеным выпадку мае высокае ацэначнае значэнне, бо творчасць Р. Баравіковай характарызуецца выразным гуманістычным пафасам, высакароднасцю і мудрасцю, эстэтычнай змястоўнасцю і разнастайнасцю. Працуючы ў межах традыцыйнай беларускай паэзіі, якая грунтуецца на фальклорнай аснове, класічным сілаба-танічным рыфмаваным вершы-маналогу, паэтэса здолела апісаць адметны лірычны характар героя, раскрыць глыбіні чалавечай душы ў яе разнастайных праявах.

Пра ўвасабленне пачуцця кахання ў паэзіі Ніны Мацяш найбольш слушна і глыбока выказаўся У. Калеснік: “У прынцыпе, гэта паэтычная філасофія кахання як загадкавага стану, дзе вітальная сіла скрыжоўваецца з сакральнай запаветнасцю. Мэта яе – азоранасць сэнсам тварэння жыцця” (У. Калеснік, 1993). Многія вершы паэтэсы пакладзены на музыку як прафесійнымі кампазітарамі, так і ёю самою. Яна скончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў, цікавымі захапленнямі паэтэсы былі вышыванне і пёркаграфія. Пра Н. Мацяш можна гаварыць як пра філосафа: яе паэзія – гэта не экзальтаваныя ўздыхі, а лірычная філасофія чалавечага духу, яго трываласці, філасофія святла і жыццялюбнасці.

Мы разгледзелі толькі трох прадстаўніц, якія пэўным чынам паўплывалі на станаўленне і развіццё жаночай паэзіі другой паловы XX стагоддзя. Ніна Мацяш у апісанні любоўных перажыванняў такая ж лірычна-сардэчная, як і Яўгенія Янішчыц, але пульс яе страфы адрозны, скажам, ад эмацыянальнага ўнутранага тонусу радкоў Раісы Баравіковай. Іх лірычная спадчына і ў наш час прыцягвае пільную ўвагу літаратуразнаўцаў і ўражвае чытачоў сваёй шчырасцю і дабрынёй.